СУСТРЭЧА З НАГОДЫ

# Размова з воінам-інтэрнацыяналістам

**Чырвонай ніткай працягнулася праз мінулы тыдзень дата 15 лютага – Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў. Тэматычныя мерапрыемствы прайшлі ў розных куточках Міёршчыны. У Цвеціне адбылася сустрэча з мясцовым жыхаром, воінам-інтэрнацыяналістам Анатолем Валынцом.**



Фота з архіва рэдакцыі.

Расказаць аднавяскоўцам пра службу ў Афганістане **Анатолю Мікалаевічу** прапанавалі супрацоўнікі мясцовых бібліятэкі і Цэнтра нацыянальнай культуры і фальклору. У бібліятэчную залу запрасілі і дзяцей, і дарослых.

– Прыйшоў Анатоль Валынец з жонкай **Кацярынай**. Шмат гадоў яны разам, у адносінах па-ранейшаму цеплыня і павага, – расказвае мастацкі кіраўнік Цвецінскага ЦНКіФ **Ксенія Красько**. – Падчас дыялогу з аўдыторыяй воін-інтэрнацыяналіст заўважыў, што служба ў Афганістане засталася ў яго памяці на ўсё жыццё. Спачатку навакольная абстаноўка падавалася чужой і страшнай, на другі год стала для салдат паўсядзённасцю.

У Афганістан Анатоль трапіў 18-гадовым юнаком. Служыў з 1985 па 1987 гады. Быў вадзіцелем. Яму пашчасціла вярнуцца дадому. Да гэтага часу трымае сувязь з некаторымі саслужыўцамі.

На памяць пра сустрэчу для госця падрыхтавала падарунак прафсаюзная пярвічка СУП «Цітова», змайстравалі сувеніры дзеці. ■

**Кацярына РЫНКЕВІЧ,**
**s.katrin.r@mail.ru**

